# Жыццё і творчасць Кузьмы Чорнага



# Дзяцінства

Кузьма Чорны (сапраўднае імя Раманоўскі Мікалай Карлавіч нарадзіўся на Случчыне ў сялянскай сям'і Карла Феліксавіча і Глікерыі Міхайлаўны. У 1907 бацькі яго пераехалі ў фальварак Вінцэнтова. Тут з дапамогай маці навучыўся чытаць. Сярод прачытанага Чорны ўспамінаў Біблію, нешта з твораў Талстога, розныя палітычныя брашуры. У дзяцінстве добра маляваў, іграў на розных музычных інструмэнтах, меў прыгожы голас, іграў у школьных спэктаклях. Каб сын мог наведваць школу, сям'я Раманоўскіх кінула панскую службу і ў 1908 вярнулася на бацькаўшчыну, у мястэчка Цімкавічы, што на паўдарозе паміж Нясьвіжам і Капылём. Вучыўся ў Цімкавіцкім народным вучылішчы, дзе паказаў сябе здольным вучнем. Пасьля сканчэння вучылішча ў 1913 настаўнік разам з іншымі выдатнікамі рыхтаваў яго да паступлення ў Нясьвіжскую настаўніцкую семінарыю. Затым два гады працаваў на гаспадарцы, разам з бацькам наймаўся цесьлем да землякоў. На далейшай вучобе сына настаяла маці Чорнага.

# Гады навучання і працы

У 1916—1919 вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай сэмінарыі. Акрамя сэмінарскай бібліятэкі меў магчымасьць наведваць і багатую Радзівілаўскую бібліятэку. На аматарскай сцэне выконваў ролю Пустарэвіча ў купалаўскай «Паўлінцы». У выніку Першай сусьветнай вайны сэмінарыя пэўны час дзейнічала ў Вязьме. Па вяртанні ў Нясвіж выявілася, што ў 1919 палякі зачынілі сэмінарыю. Толькі ў 1920 Чорны скончыў вучобу і стаў настаўнікам. У 1921 прымаў чынны ўдзел у працы мясцовых Саветаў — працаваў сакратаром Цімкаўскага валаснога рэўкома, з вясны да восені быў справаводам Слуцкага павятовага ваенкамата, затым — сакратаром аддзела народнай адукацыі пры Цімкаўскім валасным рэўкоме.

# пачатак творчага шляху

З восені 1922 г. ужо настаўнік Цімкаўскай сямігодкі, аднак, не захапіўшыся пэдагагічнай працай у 1923 годзе паступіў на літаратурнае аддзяленне пэдагагічнага Беларускага дзяржўанага ўніверсітэту. У гэтым жа годзе стаў сябрам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Яшчэ студэнтам у 1924 г. пачаў працаваць у газеце «Беларуская вёска».

У 1925 г. з-за праблемаў з лёгкімі быў вымушаны пакінуць вучобу і адправіцца ў Крым. У 1926—1931 — старшыня і галоўны рэдактар літаратурнага аб’яднання «Ўзвышша». У 1932—1937— галоўны літкансультант кабінета маладога аўтара пры СП БССР.
З 1934году — сябра Саюзу пісьменнікаў  БССР.

# Жыццё і творчасць ў гады вайны

Арыштаваны 14 кастрычніка 1938 г. Каля 8 месяцаў адсядзеў у Мінскай турме, а затым быў вызвалены 8 чэрвеня 1939 г. Тры новыя раманы, аб'ёмнае літаратуразнаўчае дасьледаванне паэмы Я. Коласа «Новая зямля» згарэлі ў першыя дні вайны. З напісанага ў гэты час захавалася толькі п'еса «Ірынка» (1940). З пачаткам вайны разам з бежанцамі дайшоў да Крычава. 10 ліпеня 1941 г. уступіў у шэрагі Чырвонай арміі, але праз некалькі дзён быў адклікаsuccessful ў Клімавічы ў групу друку. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, працаваў у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941-1944), часопісе «Беларусь». У час вайны працаваў над раманамі «Вялікі дзень» (1941—1944), «Пошукі будучыні» (1943), «Млечны Шлях» (1944), аповесьцямі (засталіся незакончанымі) «Скіп'ёўскі лес», «Сумліцкая хроніка», «Смага».

# Творчы шлях Кузьмы Чорнага

У 1927 г. быў апублікаваны яго першы раман "Сястра", у 1928 – «Зямля". Аповесці «Лявон Бушмар" (1929), "Вясна" (1930), незакончаныя творы "Вецер і пыл" (1927-1929), "ідзі, ідзі" (1930), зборнікі апавяданняў «Вераснёвыя ночы" (1929), "Нянавісць", "Буры" (абодва 1930) сведчылі не толькі пра выключную працавітасць маладога творцы, але і пра перапоўненасць яго ідэямі, тэмамі, вобразамі, што прасіліся на паперу.

Да пачатку 1930 г. у Кузьмы Чорнага выспела маштабная творчая задума– "паказаць у мастацкіх вобразах гісторыю беларускага народа... ад знішчэння паншчыны і да нашых дзён". Аднак грамадска-палітычная атмасфера гэтага часу была маласпрыяльнай для творчасці. Таталітарная сістэма распачала мэтанакіраванае вынішчэнне ўсяго свядомага, духоўнага, таленавітага. Творчая актыўнасць пісьменніка прыкметна знізілася, былі апублікаваны раманы «Бацькаўшчына" (1931), «Трэцяе пакаленне" (1935), "Трыццаць год" (1934), аповесць "Люба Лук'янская" (1937), зборнік "Брыгадзіравы апавяданні" (1932).

# Апошнія месяцы жыцця Кузьмы Чорнага

Летам 1944 вярнуўся ў Мінск, два месяцы туліўся з сям’ёй у прахадным пакоі будынка Саюза пісьменнікаў на вуліцы Бэрсана. У дзень сьмерці зрабіў запіс у дзённіку: «Я жыву як апошняе пакідзішча... Я гіну і не магу выкарыстаць як трэба свой талент. сілы мае трацяцца і марнуюцца без карысьці... Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?»

Памёр 22 лістапада 1944 г. У пакоі-кватэры. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і партызанскім мэдалём.